DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS KEEPING
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS
NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

# Archivaryus

*Collection of scientific papers and articles*

## Volume 15

Minsk
NHAB
2017

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:
*Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў* (галоўны рэдактар), *У. М. Дзянісаў, В. І. Кураш, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык, А. Рахуба, А. Я. Рыбакоў, А. Л. Самовіч, В. В. Урублеўскі* (адказны рэдактар), *М. Ф. Шумейка, Д. У. Яцэвіч*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар філалагічных навук *А. І. Мальдзіс,*
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 г. № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2017

89. Rychlikowa, I. Deklasacja drobnej szlachty w Cesarstwie Rosyjskim. Spór o «Pułapkę na szlachtę» Daniela Beauvois // Przegląd Historyczny. – 1988. – Z. 1. – S. 121–147.
90. Sienkiewicz, W. Szlachta okoliczna i «ziemianie» w regionie bialskim w XVI–XVIII w. // Z nieznanej przeszłości Białej i Podlasia. – Biała Podlaska, 1990. – S. 105–120.
91. Sienkiewicz, W. Szlachta zależna w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego : maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – 460 s.
92. Sikorska-Kulesza, J. Deklasacja drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX wieku. – Warszawa : Ajaks, 1995. – 115 s.
93. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. – T. 7. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1910. – 388 s.
94. Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. – Kórnik : Biblioteka Kórnicka, 1994. – 255 s.
95. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. – T. 2: Województwo trockie, XIV–XVIII wiek / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. P. Romaniuk. A. Haratym, przy współpr. A. Macuka, J. Aniszczanki. – Warszawa : DiG, 2009. – 764 s.
96. Urzędnicy wołyńscy XIV–XVIII. Spisy / Oprac. M. Wolski. – Kórnik : Biblioteka Kórnicka, 2007. – 189 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 04.09.2017

*М. М. Кароль*

# Супраціўленне пераводу ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гг.: дзейнасць «падбухторшчыкаў» і рэакцыя ўлад

Пасля паўстання 1863–1864 гг. расійскія ўлады актывізавалі палітыку па пераводзе насельніцтва (пераважна сялянскага) з каталіцызму ў праваслаўе, якая амаль адразу сустрэла супраціўленне тых, на каго была накіравана. Пры гэтым расійская адміністрацыя адмаўляла сялянам у актыўнай ролі ў адстойванні ранейшага веравызнання і ўскладала адказнасць за непадпарадкаванне на разнастайныя групы «падбухторшчыкаў» [1] [30, р. 171]. Галоўнымі сярод іх, на думку ўлад,

[1] «Падбухторшчыкамі» (рус. – «подстрекателями») у афіцыйным справаводственазываліся людзі, якіх улады лічылі адказнымі за непадпарадкаванне пераводу ў праваслаўе.

з'яўляліся ксяндзы, «спаланізаваная, фанатычная» шляхта і мясцовыя грамадскія актывісты, якія маглі не належаць да прывілеяваных саслоўяў, а паходзіць з мяшчан або нават уласна сялян.

Галоўнымі «падбухторшчыкамі», паводле афіцыйнага меркавання, з'яўляліся «фанатычна настроеныя» ксяндзы. Таксама і ў гістарыяграфіі найбольшая ўвага надавалася дзейнасці ксяндзоў сярод «навадалучаных». Сярод дарэвалюцыйных гісторыкаў асабліва падрабязна на гэтым спыняўся Мікалай Ізвекаў, аднак ён выкарыстоўваў пераважна матэрыялы па Літоўскай епархіі [28, с. 289–302]. З сучасных гісторыкаў дадзенае пытанне закранута ў манаграфіі Аляксандра Бендзіна [26, с. 53–58], але ён апісвае ў асноўным рэакцыю царкоўных і свецкіх улад на «супрацьзаконную дзейнасць» (азначэнне А. Бендзіна) ксяндзоў.

У 1870 г. віленскі віцэ-губернатар П.Р. Баграціён паведамляў мінскаму губернатару У.М. Токараву, што ўмовы, у якіх адбываўся перавод каталікоў у праваслаўе ў «Паўночна-Заходнім краі», выклікалі незадаволенасць рымска-каталіцкага духавенства. Апрача гэтага, ён прызнаваў, што ўжо сустракаюцца выпадкі адмоўнай рэакцыі на пераводы і самавольнага вяртання назад у каталіцызм [11, арк. 22]. Паводле меркавання П.Р. Баграціёна, калі раней ксяндзы патаемна падбухторвалі «*навадалучаных*» вярнуцца ў каталіцызм, ажыццяўлялі таемнае выкананне абрадаў, то зараз яны робяць гэта амаль адкрыта, з падтрымкай афіцыйнага духавенства, якое адмаўляецца выконваць афіцыйныя загады па забароне прымаць у сябе навадалучаных у праваслаўе і здзяйсняць над імі абрады па правілах каталіцкай царквы, нягледзячы на судовыя меры, якія прымаюцца супраць іх [11, арк. 1 адв.]. У сваім адказе мінскі губернатар адзначаў, што ў яго губерні адсутнічае актыўная прапаганда супраць далучэння да праваслаўя і адкрытая дзейнасць ксяндзоў па вяртанні ў каталіцызм. Ксяндзы абмяжоўваюцца толькі таемнай актыўнасцю ў выкананні трэб і, што вельмі важна, дзейнічаюць па-за межамі сваіх парафій [11, арк. 3].

Паводле меркавання мінскага губернатара, «*спакушэнне*» ў каталіцызм адбывалася ў вялікім горадзе, куды прыязджаў праваслаўны селянін. Менавіта там ён мог быць заахвочаны якім-небудзь каталіком, з якім ішоў у мясцовы касцёл на споведзь і ўжо пасля гэтага пераставаў хадзіць у праваслаўную царкву [11, арк. 3 адв.]. Таксама ў дакументах расійскай адміністрацыі адзначаецца, што ксяндзы, з мэтай абараніць касцёлы ад закрыцця, маглі штучна павялічваць колькасць парафіян свайго касцёла. Напрыклад, па Мікалаеўшчынскай і Задзвейскай парафіях былі пададзены звесткі аб адпаведна 3586 і 1238 душах, а, паводле падлікаў расійскай адміністрацыі, атрымлівалася 1541 і 91 душа парафіян, што на 3082 менш за лічбы, сабраныя ксяндзамі [11, арк. 4]. Ксяндзам забаранялася здзяйсняць трэбы не ў сваёй парафіі, і выключэнне рабілася толькі для паміраючых прыезджых. Тым не менш, ксяндзы

імкнуліся аказаць маральную і пастарскую падтрымку парафіянам ліквідаваных каталіцкіх прыходаў. Паводле рапарта ваеннага начальніка Ігуменскага павета да мінскага губернатара ад 4 лістапада 1865 г., адзначаліся неправамоцныя дзеянні бярэзінскага ксяндза Тамковіча. Ён актыўна займаўся адгаворваннем мясцовых каталікоў ад прыняцця праваслаўя. Падчас следства было высветлена, што ксёндз Тамковіч быў у ваколіцы Белічаны ў шляхціца Казіміра Саматыі і пераконваў яго «*моцна трымацца сваёй веры і не далучацца да праваслаўя*» [1, арк 1 адв.]. На выездзе з Белічанаў ксёндз меў размову яшчэ з трыма шляхціцамі, якія мелі намер змяніць веру, для чаго звярнуліся да яго па параду. Як перадаў пасля мясцоваму жандару адзін з гэтых шляхціцаў Пётр Тоўсцік, ксёндз загадаў ім: *«Напінайце жылы, як спружыны»* [1, арк 1 адв.]. За свае дзеянні ксёндз Тамковіч быў накіраваны ў Ігумен для правядзення следства і вызначэння яго віны.

Ксяндзы сапраўды, перш за ўсё шляхам угавораў, імкнуліся захаваць сваю паству і перашкодзіць яе пераходу ў праваслаўе (нават добраахвотнаму). У Невелі павятовы спраўнік прапаноўваў выдаліць з горада дэкана ксяндза Адама Сямашку за тое, што ён, карыстаючыся сваім аўтарытэтам, адгаворвае шляхту ад пераходу ў праваслаўе. Пры гэтым шляхта, наколькі можна меркаваць са зместу справы, сама выказвала намер прыняць праваслаўе, верагодна, тым самым, спрабуючы выказаць сваю лаяльнасць уладам пасля паўстання 1863–1864 гг. [20, арк. 6 адв.].

Нярэдка расійскія ўлады спрабавалі дыскрэдытаваць ксяндзоў, абвінавачваючы іх не толькі ў падбухторванні да невыканання праваслаўных абрадаў, але і ў адміністрацыйных парушэннях і неадпаведных сану паводзінах. Напрыклад, святара філіяльнай капліцы ў мястэчку Лоеў Рэчыцкага павета Фларыяна Кунцэвіча абвінавачвалі ў 1868 г. у нецвярозых і буйных паводзінах, абразе станавога прыстава падчас выканання ім службовых абавязкаў. Гэта спалучалася з абвінавачваннямі ксяндза ў непавазе да абрадаў праваслаўнай царквы. Усё гэта дало падставу рэчыцкаму павятоваму спраўніку У.І. Ульянаву, спасылаючыся на малую колькасць каталікоў у мястэчку, прапаноўваць наогул зачыніць капліцу, а парафіян размеркаваць паміж суседнімі касцёламі – Рэчыцкім і Астраглядаўскім [3, арк. 11]. У 1875 г. епіскап бабруйскі і мінскі Аляксандр паведамляў мінскаму губернатару У. М. Токараву пра дзеянні ксяндза Ракаўскага касцёла Адама Пласкавіцкага. У адпаведнасці з дадзенай епіскапам характарыстыкай, ксёндз быў вядомым «*фанатыкам і прапагандыстам*» [12, арк. 2], пры споведзі ўнушаў каталікам нянавісць да ўсяго рускага і праваслаўнай веры, загадваў ім ніколі не наведваць праваслаўнай царквы. Прычым, паводле звестак епіскапа, на ксяндза данеслі мясцоваму праваслаўнаму святару самі каталікі [12, арк. 2]. Для яшчэ большага ачарнення ксяндза епіскап прыпісваў яму

ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг., але доказаў не прыводзіў [2]. Дзейнасць ксяндза была накіравана на прыхаджан Валмянскай праваслаўнай парафіі. Каб спыніць яго актыўнасць, праваслаўны епіскап прапаноўваў выдаліць А. Пласкавіцкага з Ракава. Цікавым з'яўляецца факт, што мясцовы прыстаў Ф.Г. Шаблееў, які павінен быў назіраць за ксяндзом, сам быў невялікім прыхільнікам праваслаўя – святароў называў не інакш як *«папішкамі»* і дазваляў выступаць А. Пласкавіцкаму з публічнымі казаннямі [12, арк. 3]. Апрача сваіх парафіян, паслухаць выступленні ксяндза прыходзілі і парафіяне суседняга Каменскага касцёла [12, арк. 1].

Істотным клопатам расійскай адміністрацыі было трыманне людзей у праваслаўі – як навадалучаных, так і тых, хто быў праваслаўным на працягу многіх пакаленняў. І адны, і другія, на думку прадстаўнікоў мясцовага чыноўніцкага і паліцэйскага апарату, маглі падпадаць пад уплыў каталіцтва. Так, за ксяндзом-капеланам Кімбараўскага жаночага кляштара Феліксам Урбіковічам за агітацыю праваслаўных да вяртання ў каталіцтва, з 16 сакавіка 1865 г. быў усталяваны гласны нагляд паліцыі [16, арк. 109а адв.–110, 190 адв.–191].

У кантактных рэгіёнах, дзе былі вялікія грамады як праваслаўных, так і каталікоў, улад непакоіў рэлігійны стан праваслаўных наогул. Так, з данясення віленскаму генерал-губернатару К.П. фон Каўфману ад 4 ліпеня 1865 г. робіцца відавочным, што праваслаўныя жыхары «*заходніх паветаў*» Віцебскай губерні *«ў выніку працяглага панавання каталіцызму і ўніі»*, а таксама прапаганды з боку ксяндзоў і памешчыкаў, з большай ахвотай наведваюць касцёл, а не праваслаўную царкву, а таксама робяць рознага кшталту падараванні ў касцёл *«ва ўрон праваслаўным даходам»* [20, арк. 1 адв.]. У штодзённай абраднасці сяляне таксама прытрымліваюцца каталіцкіх традыцый (напрыклад, хрысцяцца не ў адпаведнасці з праваслаўнымі звычаямі) [20, арк. 1 адв.; 28, с. 270].

У катэгорыю «падбухторшчыкаў», апрача каталіцкага духавенства, трапляла і мясцовая шляхта, якую не закранулі рэпрэсіі пасля паўстання 1863–1864 гг. [28, с. 303–305]. Ваенны начальнік Себежскага павета А.І. Якаўлеў у сваім рапарце ад 4 красавіка 1864 г. віцебскаму ваеннаму начальніку У.М. Вяроўкіну галоўнай прычынай супраціўлення пераводу ў праваслаўе называў наяўнасць *«паноў»*, якія на падставе былога прыгоннага права, бралі на службу сялянскіх дзяцей і паступова прымушалі іх прыняць сваю *«панскую веру»* [3]. Ён лічыў, што так адбылося ў выпад-

---

[2] Звестак пра ўдзел А. Пласкавіцкага ў паўстанні 1863–1864 гг. не маецца і ў незалежных крыніцах [29, с. 422–467]. Магчыма, епіскап мэтанакіравана нагаворваў на яго, аднак нельга выключаць магчымасці, што ксёндз, калі не ўдзельнічаў у паўстанні асабіста, то спачуваў яму, пра што магло быць вядома іншым.

[3] Магчыма, гаворка ішла пра аднаго з братоў Вяльгорскіх – Мечыслава ці Міхала, – якія былі сасланы за ўдзел у паўстанні [29, с. 140].

ку з былой дваравой сялянкай Юзэфай Сцяпанавай, якая з праваслаўнай сям'і трапіла ў дом памешчыка Вяльгорскага [23, арк. 2]. Яна, паводле звестак святара Восынскай царквы, адмаўлялася прыняць праваслаўе, прытым, што раней ужо прымала яго, і яе бацькі былі праваслаўнымі. У прысутнасці начальніка яна паўторна заявіла аб сваім нежаданні вяртацца ў праваслаўе. Ваенны начальнік прапаноўваў У.М. Вяроўкіну падвергнуць Ю. Сцяпанаву суроваму манастырскаму пакаранню або высылцы ў аддаленыя месцы Расійскай імперыі для прыкладу іншым [22, арк. 1 адв.]. На яго думку, толькі такімі захадамі можна прадухіліць паўтарэнне выпадкаў адмовы вызнаваць праваслаўную веру.

Таксама ваенны начальнік паведамляў, што падчас аб'езду павета святар Дзедзінскай царквы паведаміў яму, што мяшчанка Усціння Аляксандрава, якая жыла ў карчме ў вёсцы Грошава, з'яўляючыся праваслаўнай, *«спакушала»* ў каталіцызм жыхароў суседніх вёсак [22, арк. 1]. Сама Усціння сведчыла, што яна насамрэч спявала некаторыя малітвы па-польску, але на момант следства цалкам адмовілася ад ранейшых паказанняў. Удава з вёскі Грошава Варвара і дзеўка Праскоўя сведчылі, што насамрэч Усціння Аляксандрава вучыла іх па-польску, і на пытанне, ці ведаюць яны малітвы па-руску, адказалі, што не, бо іх ніхто ніколі не вучыў – не было каму, іх бацькі былі ўніятамі, а амаль усе моляцца папольску [22, арк. 1 адв.].

У Лепельскім павеце было праведзена следства адносна сям'і селяніна Казіміра Максімавіча Зуева, які, з'яўляючыся каталіком, ажаніўся з праваслаўнай Агаф'яй Кірылавай. У далейшым яны хрысцілі дзяцей у касцёле. Жонка Зуева таксама для споведзі наведвала касцёл. Паліцыя знайшла *«вінаватага»* ў асобе іх ранейшага памешчыка Анікевіча, які прымушаў Зуевых хадзіць у касцёл. У выніку праведзеных мерапрыемстваў сям'я Зуевых, *«усведамляючы свае памылковыя перакананні»*, вярнулася ва «ўлонне Праваслаўнай царквы» [21, арк. 3]. Нельга не заўважыць, што афіцыйныя асобы зусім не бралі ў разлік тое, што Агаф'я Зуева наведвала касцёл паводле ўласнага жадання ці пад уплывам мужакаталіка, а сам Казімір Зуеў мог імкнуцца выхоўваць дзяцей у сваёй веры.

Улады мелі намер кантраляваць нават сямейнае жыццё буйных памешчыкаў. Адзін з самых заможных землеўладальнікаў Рэчыцкага павета Людвік Ракіцкі (каталік, ахрышчаны ў Астраглядаўскім касцёле [19, арк. 91–91 адв.] забараняў сваім жонцы і дзецям здзяйсняць абрады праваслаўнай веры [5, арк. 1]. Жонка графа Л. Ракіцкага Марыя Аляксандраўна паходзіла з простых сялян, таму, натуральна, што муж меў вялікі ўплыў на яе. Рэчыцкі павятовы спраўнік характарызаваў яе ў сваім рапарце ад 29 сакавіка 1869, як жанчыну *«неразвітую і простую»* [5, арк. 9]. 6 лістапада 1866 г. у Л. Ракіцкага нарадзілася дачка Анта-

ніна, якую ён працяглы час не хрысціў у праваслаўі. Абраць менавіта гэтую веру для дзіця памешчык каталіцкага веравызнання быў абавязаны ў адпаведнасці з законамі Расійскай імперыі, бо яго жонка была праваслаўнай. Апрача гэтага, нягледзячы на дадзеную перад шлюбам распіску выхоўваць дзяцей у праваслаўі, Л. Ракіцкі *«выхоўвае іх у духу і абраднасці лацінства»* [5, арк. 6]. Паводле звестак мясцовых святароў, памешчык забараняў жонцы і дзецям наведваць праваслаўныя храмы, у выніку графіня Ракіцкая з дзецьмі не наведвалі ні праваслаўную царкву, ні касцёл [5, арк. 23].

Часта расійскай адміністрацыі даводзілася сутыкацца з актыўным адстойваннем сваёй канфесійнай ідэнтычнасці з боку саміх былых каталіцкіх парафіян, прынамсі, іх часткі, але і ў такім выпадку ўлады імкнуліся вылучыць з сялянскага асяроддзя завадатараў пратэсту. Напрыклад, былыя парафіяне закрытага Ішкалдскага касцёла звярнуліся ў Дэпартамент духоўных спраў замежнага веравызнання ў 1876 г. з просьбай вярнуць ім названы касцёл. У выніку гэтага мясцовымі ўладамі прадугледжвалася правесці расследаванне, хто быў *«зачыншчыкам і падбухторшчыкам»* да складання такога прашэння. Прашэнне было адхілена, а падбухторшчыкамі прызнаны мешчанін мястэчка Ішкалдзь Карл Хвошч і селянін Іван Адамовіч, якія былі ўпаўнаважаны іншымі сялянамі падаць гэтае прашэнне [15, арк. 4].

Падчас следства аб непадпарадкаванні сялян у вёсцы Хатава Тонава-Слабодскага прыходу мінскі губернатар В. І. Чарыкаў загадаў правесці негласнае дазнанне аб падбухторванні сялян з боку іх аднавяскоўцаў Юзафа Ярмалкевіча, Вінцэнта Томкі і інш. [13, арк. 8]. У вёсцы Лапаравічы ў 1875 г. у якасці падбухторшчыкаў былі вылучаны Міхал Казак і Андрэй Татарын, для чаго падставай стала тое, што яны неаднаразова звярталіся з прашэннямі аб вяртанні ў каталіцызм [14, арк. 23].

«Хатаўская» справа мела працяг. Паводле даклада міравога пасрэдніка А.А. Дзмітрыева ад 9 чэрвеня 1876 г., падчас рэвізіі да яго звярнулася вельмі шмат сялян з просьбай вызваліць іх ад *«ганенняў»* з боку мясцовага праваслаўнага святара. Гэтыя *«ганенні»* прывялі да таго, што сяляне сталі адмаўляцца запрашаць яго для выканання рэлігійных абрадаў і праводзілі пахаванні без святара. Раз'юшанасць сялян была такой моцнай, што яны, не хаваючыся, абражалі праваслаўнага святара, які не карыстаўся сярод іх аўтарытэтам [14, арк. 32]. У той самай мясцовасці жыў Леанард-Рыгор Іванавіч Бараноўскі, які, на думку ўлад, з'яўляўся галоўным падбухторшчыкам мясцовых жыхароў. Паводле звестак міравога пасрэдніка, Л.-Р. І. Бараноўскі, насамрэч, раней быў асуджаны, у тым ліку за тое, што выдаваў сябе за чыноўніка губернатара. Паводле меркавання пасрэдніка, Бараноўскі быў паверанным сялян, а таксама *«эксплуатуе іх, развівае паклёпніцтва і распальвае пачуцці і без таго*

*ўжо незадаволенага сялянскага саслоўя»* [14, арк. 33]. Як вынікае з дазнання мінскага павятовага спраўніка Э.Х. Капгера, Леанард Бараноўскі з'яўляўся мешчанінам г. Мінска, які ў 1863–1864 гг. перайшоў з каталіцызму ў праваслаўе. На думку ўлад, Л.-Р. Бараноўскі зарабляў грошы напісаннем прашэнняў ад імя сялян. Пры гэтым не ўсе прашэнні аб дазволе вярнуцца ў каталіцкую веру былі напісаны яго почыркам, але лічылася, што менавіта паводле яго ініцыятывы. У выніку спраўнік прапанаваў выслаць Л.-Р. Бараноўскага ў аддаленыя губерні Расійскай імперыі як асобу «*шкодную ў асяродку сялянскага насельніцтва*» [14, арк. 52]. Акрамя Леанарда Бараноўскага, падбухторшчыкі расшукваліся і ў асяродку саміх сялян, якія падавалі прашэнні з Тонава-Слабодскага прыхода. Імі былі прызнаны сяляне вёскі Хатава Антоні Багданкевіч, вёскі Жыдавічы Антоні Чарняўскі і вёскі Лапаравічы Міхал Казак. Іх характарызавалі як галоўных *«падбухторшчыкаў»* сялян да ўхілення ад выканання абрадаў праваслаўнай веры [14, арк. 67]. А. Чарняўскі і А. Багданкевіч сасланы ў Валагодскую губерню пад нагляд паліцыі [14, арк. 76–76 адв.].

Гучная справа па пошуку падбухторшчыкаў была распачата ў мястэчку Волма Мінскага павета. Пасля закрыцця касцёла і пераводу насельніцтва ў праваслаўе адміністрацыя і мясцовы святар Міхаіл Валачкевіч сустрэлі актыўнае супраціўленне з боку жыхароў воласці. Епіскап мінскі і бабруйскі Аляксандр (Дабрынін) паведамляў аб атрыманых ад станькаўскага благачыннага Пятра Трускоўскага звестках аб сялянах вёсак Сурцыны і Хімароды Іване Антонавічы Чарняўскім і Іване Іосіфавічы Хімародзе, якія першапачаткова выконвалі абрады праваслаўнай веры, а пасля, у выніку падбухторвання «нядобранадзейных» людзей, перасталі хадзіць у царкву, пакідалі без хрышчэння народжаных дзяцей і самастойна хавалі памерлых. Таму, на яго думку, неабходна даслаць у Валмянскі прыход чыноўніка, які правядзе следства і пошук падбухторшчыка, а таксама патлумачыць разам з духавенствам, што яны не могуць вярнуцца ў каталіцызм, а Валмянская царква ніколі не будзе зноў ператорана ў касцёл [9, арк. 6]. У выніку расследавання ўладамі быў выяўлены галоўны «падбухторшчык» – селянін Іван Лапа. Ён быў абвінавачаны ў зборы грошаў для напісання хадайніцтваў аб захаванні ў каталіцызме і накіраваны ў Мінск для далейшага разбіральніцтва.

Нежаданне сялян заставацца ў праваслаўі часам прыводзіла да цяжкасцей у ажыццяўленні пэўных адміністрацыйных працэдур. Так, судовы следчы Мінскага павета падчас следства па справе аб *«крадзяжы бульбы ў Шулінскага і Ігнатовіча»* не змог правесці неабходны допыт сведак. Сяляне вёскі Якуты Валмянскай сельскай грамады адмовіліся выканаць прысягу, абгрунтоўваючы гэта тым, што былі гвалтоўна запісаны ў праваслаўе, а таму не жадаюць прысягаць святару, а патрабуюць

для гэтага ксяндза Ракаўскага касцёла. Калі следчы прыгразіў штрафамі, незадаволенасць сунялася, але затым зноў аднавілася. Сярод сялян найбольш актыўна выказваўся Іван Грыгаровіч. Паводле слоў следчага, на спробы яго супакоіць І. Грыгаровіч адказваў *«дзёрзка і нахабна»*. Значны маральны аўтарытэт І. Грыгаровіча і яго роля завадатара ў справе непадпарадкавання падкрэслівалася тым, што толькі пасля таго як ён пакінуў сход, іншыя вяскоўцы выканалі прысягу [9, арк. 17 адв.].

Святар Валмянскай царквы Міхаіл Валачкевіч у 1869 г. паведамляў аб нежаданні жыхароў Волмы хадзіць у праваслаўную царкву, бо, паводле чутак, памешчык Ваньковіч будзе будаваць у сваім фальварку Набароўшчына каменны касцёл, да якога будуць належаць усе прыхаджане ліквідаванага Івянецкага касцёла [10, арк. 20 адв.]. Апрача таго, ён адзначаў, што сяляне кпілі з царкоўнага старасты Адама Трызны, што той здзяйсняе абрады паводле правілаў праваслаўнай веры і казалі: *«ды і нас цяпер просяць, а мы і слухаць не хочам, вось было два чыноўнікі, якія прызналі нас каталікамі»* [9, арк. 20 адв.]. Падбухторшчыкамі да непаслушэнства былі прызнаны Адам Лапа і Юры Прыстрома, якія распусцілі чуткі, што, тыя хто не быў на споведзі ў 1869 г., застануцца ў каталіцызме, і што быццам бы гэта сказана А. Лапу і Ю. Прыстрому *«епіскапам Вайткевічам»* [9, арк. 23 адв.].

Вялікую ролю ў «валмянскай справе» гралі і чуткі, якія распаўсюджваліся сярод насельніцтва і ўплывалі на яго нежаданне выконваць абрады паводле правілаў праваслаўнай веры. Пасля далучэння Валмянскай воласці да Велікасельскага праўлення, мясцовае насельніцтва было ўсцешана гэтым фактам, бо цяпер да іх перастануць ездзіць чыноўнікі, а таксама ў святара не будзе магчымасці часта праводзіць з імі размовы аб неабходнасці выканання праваслаўных абрадаў. Апрача таго, яны спасылаліся на невядомага чалавека, які прычыніўся да закрыцця праўлення, і што менавіта ён дапаможа ім у хуткім часе далучыцца да парафіі Ракаўскага касцёла. Нарэшце, сяляне распаўсюджвалі чуткі аб *«вядомым ім чалавеку»*, які адчыніць у Волме касцёл. У выніку менавіта з-за распаўсюджвання чутак на адну з нядзельных службаў ніхто не прыйшоў [9, арк. 39–39 адв.].

На думку чыноўнікаў, якія праводзілі следства, было дзве прычыны, з-за якіх адбываліся хваляванні ў Слабодскай і Велікасельскай валасцях. Па-першае, значную ролю ў гэтым гралі мясцовыя ксяндзы, якія хрысцілі дзяцей новадалучаных у праваслаўе паводле рымска-каталіцкага абраду, здзяйснялі трэбы і папракалі новадалучаных за пераход у праваслаўе. Па-другое, тое, што сярод сялян ёсць асобы, якія моцна настроены супраць праваслаўя, уплываюць на свой асяродак і падбухторваюць аднавяскоўцаў не хадзіць на споведзь. Некаторыя з іх нават

займаюцца напісаннем прашэнняў і распаўсюджваннем сярод людзей чутак [9, арк. 54 адв.].

Паводле паведамлення епіскапа мінскага і бабруйскага Аляксандра (Дабрыніна) мінскаму губернатару У.М. Токараву, было праведзена следства аб пошуку падбухторшчыкаў з ліку ксяндзоў і памешчыкаў. У выніку аўтарам аднаго з прашэнняў аказаўся лёкай памешчыка Л. Ваньковіча. У далейшым вінаватымі ў напісанні прашэнняў былі прызнаны селянін Квяткоўскі і ўнтэр-афіцэр Станіслаў Савіцкі, якія былі асуджаны на турэмнае зняволенне і штраф. За распаўсюджанне чутак аб тым, што былы міравы пасрэднік быў звольнены за далучэнне сялян да праваслаўя і закрыццё касцёла, мясцовы памешчык Пратасевіч [4] быў зняволены ў крэпасць. Што датычыцца памешчыка Л. Ваньковіча, то ён быў прызнаны невінаватым [9, арк. 59 адв., 77].

Епіскап мінскі і тураўскі Варлаам (Чарняўскі) у 1887 г. скардзіўся мінскаму губернатару М.М. Трубяцкому, што асобы польскага паходжання і рымска-каталіцкага веравызнання дагэтуль *«дыхаюць нянавісцю да праваслаўя і праваслаўнай царквы, што нават наважваюцца публічна перад сялянамі праваслаўнага веравызнання ганіць і зневажаць Праваслаўную царкву і яе духавенства з выдавочным намерам пагарды і абразы»* [18, арк. 3]. Справа заключалася ў тым, што святар Уздзенскай царквы Парфірый Струкоўскі загадаў сялянам вёскі Каменка Ігуменскага павета прывесці да царквы пяску. Калі сяляне пачалі браць пясок на зямлі памешчыка Яна-Казіміра Завішы, пад'ехаў аканом маёнтка Кухцічы дваранін Ігнат Віткоўскі, які забараніў ім гэта рабіць, а даведаўшыся, што пясок пойдзе на патрэбы царквы, пачаў непрыстойна лаяцца, дадаючы *«... з Вашай Царквой»*. З аднаго боку, можна меркаваць, што незадаволенасць аканома І. Віткоўскага была выклікана выключна самавольнымі дзеяннямі сялян, а з іншага боку, епіскап Варлаам і святар П. Струкоўскі імкнуліся надаць яго дзеянням палітычны сэнс. П. Струкоўскі дакладаў епіскапу, што І. Віткоўскі ўжо неаднаразова выказваўся супраць праваслаўя і *«рускай народнасці»*, а таксама, што быў заўважаны ва ўдзеле ў паўстанні 1863–1864 гг., але не прыводзіў доказаў [17, арк. 4]. Ігнат Віткоўскі, насамрэч, быў удзельнікам паўстання 1863–1864 гг. Ён знаходзіўся ў паўстанцкім атрадзе, але добраахвотна з'явіўся да расійскіх улад, пасля чаго быў арыштаваны і трапіў пад следства ў Ігуменскім следчым камітэце [29, с. 129].

Асаблівую пагрозу расійская адміністрацыя бачыла ў каталіках, якія жылі ў асяроддзі *«навадалучаных»* [27, с. 431–433]. Часта яны карысталіся вялікім аўтарытэтам сярод мясцовых жыхароў і маглі ўплываць

[4] У справе імя памешчыка не называецца. Верагодна, ім быў або Алаізій Францавіч Пратасевіч, або яго сын Валерыян.

на фарміраванне іх грамадскай думкі. Улады імкнуліся ўсімі магчымымі сіламі перавесці такіх асабліва адданых вернікаў у праваслаўе або выслаць у аддаленыя рэгіёны Расійскай імперыі. Адзін з такіх выпадкаў адбыўся ў Ракаўскай воласці Мінскага павета. Паводле рапарта ваеннага начальніка Мінскага павета М.М. Бальшова ад 12 студзеня 1866 г., жонка селяніна Людвіга Янчэўскага Іанна Андрэеўна, якая была праваслаўнага веравызнання, не пусціла ў дом праваслаўнага святара Якава Мацкевіча, патлумачыўшы гэта тым, што ёй забараніў муж. Па звестках з рапарта, муж і сын Янчэўскай былі вядомы сваім фанатызмам, нянавісцю да ўсяго «рускага» і палітычнай нядобранадзейнасцю. Яе сын Юльян Янчэўскі быў ужо аднойчы аштрафаваны на 25 рублёў срэбрам за *«спакушэнне праваслаўных»* [2, арк. 2]. Ваенны начальнік прапаноўваў выселіць Людвіга Янчэўскага разам з сынам Юльянам ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі, каб пазбегнуць яшчэ большай шкоды для праваслаўнага насельніцтва. Аднак цікавымі тут з'яўляюцца паказанні жонкі Л. Янчэўскага Іанны Андрэеўны. Насуперак сведчанню ваеннага начальніка, жанчына сцвярджала, што муж не забараняў ёй пускаць у дом праваслаўнага святара. І. Янчэўская казала, што не прыняла яго па прычыне непрыбранага дома, а мужа нават дома не было, таму ён не мог загадаць не пускаць святара [2, арк. 2 адв.]. У сваю чаргу, кардынальна адрозніваюцца паказанні святара Я. Мацкевіча. Ён сцвярджаў, што 5 студзеня, перад святам, Іанна Янчэўская не пусціла яго ў дом са словамі *«каталіцкі лацінскі ксёндз не бывае ў нас дома, так і вы не ідзіце, не патрэбна»* [2, арк. 3]. На думку святара, такім словам яе маглі навучыць толькі палітычна нядобранадзейныя муж і сыны. З паказанняў святара Я. Мацкевіча бачна, што Людвіг Янчэўскі са сваімі сынамі сімпатызавалі паўстанню. Апрача таго, Янчэўскія займаліся рамесніцтвам, мелі цесныя кантакты з сельскім насельніцтвам, таму, на думку святара, маглі *«неадукаванаму народу ўнушаць свае бязглуздыя фанатычныя думкі, супярэчныя і шкодныя нашай Веры і Айчыне»* [2, арк. 2]. Для фарміравання вобразу «падбухторшчыка» ў вачах расійскіх улад немалую ролю адыграла тое, што сын Людвіга Янчэўскага Юльян атрымаў адукацыю ў *«ссыльнай па палітычнай справе»* (за ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг.) памешчыцы Ганны Свентаржэцкай [29, с. 513]. Гісторыя Людвіга Янчэўскага мела працяг. У 1869 г. ён падаў прашэнне, у якім пісаў, што ён, яго бацька і дзед заўжды вызнавалі рымска-каталіцкую веру і належалі да Ракаўскай рымска-каталіцкай парафіі. У 1837 г. ён узяў шлюб з Іаанай Ступкевіч, на той момант уніяцкага веравызнання. У адпаведнасці з тагачаснымі законамі, іх сыны былі ахрышчаны ў каталіцтва, а дочкі – ва ўніяцтва. Аднак у 1868 г. святар Я. Мацкевіч загадаў Ракаўскаму валасному праўленню, каб Янчэўскі разам з сынамі

дастаўляліся да яго кожную суботу і кожную нядзелю для пераконвання ў неабходнасці пераходу ў праваслаўную веру [6, арк. 1 адв.].

Епіскап мінскі і бабруйскі Аляксандр прапаноўваў выдаліць з вёскі Хатава селяніна Нікадзіма Чашко, які падбухторваў новадалучаных сялян не выконваць абрады па правілах праваслаўнай веры [8, арк. 1]. Пры гэтым Н. Чашко характарызаваўся як чалавек заможны, які карыстаецца ўплывам сярод іншых жыхароў вёскі. У снежні 1868 г. Н. Чашко ў прысутнасці мясцовага святара, валаснога старшыні і сельскіх старастаў заявіў, што, нягледзячы на тое што ён быў далучаны да праваслаўя, ён не будзе наведваць праваслаўную царкву [8, арк. 1 адв.]. У выніку было вырашана накіраваць Н. Чашко да святара для пераконванняў і размоў, а ў выпадку калі не дапаможа, то ён будзе асуджаны *«паводле закону»* [8, арк. 8 адв.]. Падобны выпадак здарыўся з селянінам мястэчка Клецк Слуцкага павета Адамам Якімовічам, якога абвінавацілі ў асуджэнні праваслаўнай веры і *«спакушэнні ў лацінства»* [4, арк. 2]. Паводле рашэння суда, А. Якімовіч быў вызвалены ад пакарання. Аднак, прыняўшы 25 лютага 1867 г. праваслаўе, ён працягваў ухіляцца ад выканання абрадаў праваслаўнай веры і трэб. З-за чаго ўладамі было вырашана ўсталяваць за ім паліцэйскі нагляд [4, арк. 8]. У вёсках Вядзьма і Навасёлкі Навагрудскага павета станавым прыставам Іосіфам Рыхліцкім у 1869 г. было выяўлена *«шмат асоб польскай шляхты і ксяндзоў»*, якія падбухторвалі сялян не звяртацца да праваслаўнага святара па духоўныя трэбы [7, арк. 1–1 адв.]. Аднак у выніку аказалася, што ініцыятарамі непадпарадкавання былі самі сяляне Вядзьменскай і Навасельскай грамад Дараўскай воласці. Калі распаўсюдзіліся чуткі пра магчымасці вярнуцца ў каталіцтва, Ігнат Буцко, Карл Ястрэмбінскі, унтэр-афіцэр Адам Лойка накіраваліся ў Мінск з намерам прынесці прашэнне губернатару. На шляху ў мястэчку Койданава яны сустрэлі незнаёмага чалавека, які 5 ліпеня 1869 г. напісаў ім прашэнне. Іх аднавяскоўцы сведчылі, што прашэнне, якое яны падалі 11 ліпеня таго ж года таксама напісаў незнаёмы ім чалавек у мястэчку Ляхавічы Слуцкага павета. Сяляне сцвярджалі, што пісаць прашэнні іх ніхто не падбухторваў, але пры гэтым, адмаўлялі напісаную ў гэтых прашэннях інфармацыю, быццам бы яны казалі пра гвалтоўнае далучэнне да праваслаўя, збіццё нагайкамі і г.д. [7, арк. 5]. У ходзе следства высветлілася, што абодва прашэнні напісаны рукой аднаго чалавека, а менавіта непаўнагадовага сына памешчыка Алаізія Міладоўскага. Апрача гэтага, падазраваліся памешчык Ігнат Яцкоўскі, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., і яго сястра, якія пражывалі на хутары Кулік, недалёка ад вёсак Вядзьма і Навасёлкі, і прымалі ўдзел у хрышчэнні дзяцей сялян Казіміра Сянькоўскага і унтэр-афіцэра Адама Лойкі паводле каталіцкага абраду [7, арк. 5 адв.].

Правакатарамі, на думку афіцыйных улад, маглі апынуцца людзі і без актыўнай грамадзянскай пазіцыі, якія не былі заўважаны ў падбухторванні іншых да пераходу ў каталіцызм, але займалі важную пасаду і маглі мець уплыў на насельніцтва. У 1867 г. менавіта ў сувязі з гэтым знялі з пасады старшыню Каханавіцкай воласці Дрысенскага павета Захара Гаўрылавіча Мятліцкага [24, арк. 1]. З. Г. Мятліцкі нарадзіўся ў сям'і праваслаўнага Гаўрылы Чырвонца, але яго сапраўдным бацькам быў каталік Феліцыян Мятліцкі, які памёр за два месяцы да яго нараджэння, а маці Захара Алена, якая таксама была каталічкай, выйшла замуж за Г. Чырвонца. Прынамсі, так прадстаўляў сваё паходжанне сам Мятліцкі. Яго словы пацвярджаюцца сямейнымі спісамі, дзе ён паказаны як зводны брат Яўстафія Феліцыянавіча Мятліцкага. Сам Захар Мятліцкі лічыў сябе каталіком, з 1854 г. перастаў наведваць Каханавіцкую царкву і хадзіў на споведзь да ксяндза Асвейскага касцёла. У спавядальных ведамасцях Асвейскага касцёла за 1853 г. маецца запіс пра жыхара вёскі Вышнарава Яўстафія Мятліцкага [25, арк. 55 адв.], але пазнакі пра наведванне споведзі ў касцёле самім Захарам Мятліцкім адсутнічаюць, верагодна, таму што ксёндз прымаў яго таемна (як фармальна праваслаўнага). Нягледзячы на тое што З. Г. Мятліцкі не быў прызнаны вінаватым у сваім пераходзе ў каталіцызм або «спакушэнні» іншых парафіян Каханавіцкай царквы, было вырашана, што ён не можа займаць пасаду старшыні сельскай грамады як асоба, якая будзе мець шкодныя ўплывы на *«неразумныя асобы непісьменных і неразвітых сялян»* [24, арк. 5].

Расійская адміністрацыя паслядоўна апісвала беларускае сялянства як няздольнае да свядомага канфесійнага выбару, разглядала яго як пасіўную масу, якая паддаецца знешнім уплывам пры выбары на карысць каталіцызму. Вельмі яскрава такі падыход пададзены ў згаданым вышэй данясенні віленскаму генерал-губернатару за 4 ліпеня 1865 г. У ім адзначаецца, што ў касцёл сяляне нібыта ішлі праз арганную музыку, прыгожы знешні выгляд і зручнасць размяшчэння – *«вабіць іх прыгажосць, якая засланяе сабой убогія цэрквы, і гукі аргана, і яшчэ тая акалічнасць, што таргі, базары, кірмашы паводле здаўна мэтанакіравана ўведзенага каталіцкай прапагандай парадку пераважна размяшчаюцца паблізу касцёлаў»* [20, арк. 1 адв.].

Аднак на практыцы мясцовыя чыноўнікі і паліцэйскія нярэдка сутыкаліся са свядомым супраціўленнем пераводу ў праваслаўе. У такіх выпадках пры разглядзе прашэнняў былых каталікоў (або ўніятаў) вялікая ўвага надавалася пошуку «падбухторшчыкаў», якія маглі агітаваць «новадалучаных» на напісанне прашэнняў аб вяртанні іх у каталіцтва. У першую чаргу, «падбухторшчыкаў» расшуквалі ў асяродку ксяндзоў бліжэйшых касцёлаў або памешчыкаў, якія характарызаваліся як *«спа-*

*ланізаваная фанатычная шляхта»*. Аднак часцей здараліся выпадкі, калі «падбухторшчыкамі» аказваліся самі мясцовыя сяляне з ліку тых, хто пісаў прашэнні. Пераважна гэта былі людзі заможныя, з адукацыяй, былыя вайскоўцы і службоўцы, якія карысталіся аўтарытэтам і павагай у сваім асяроддзі. Гэта ўказвае на тое, што сяляне не былі пасіўнай масай, а актыўна адстойвалі сваю канфесійную ідэнтычнасць. Адзначым, што пры фарміраванні вобраза «падбухторшчыка» адміністрацыя часта апелявала да ўдзелу ў паўстанні (уяўным або сапраўдным), спаланізаванасці і асаблівай каталіцкай фанатычнасці.

## Крыніцы і літаратура


1. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1763. – Рапарт ваеннага начальніка Ігуменскага павета аб пераконванні ксяндзом Тамковічам бярэзінскіх прыхаджан у непрыняцці праваслаўнай веры. 1865 г. – 2 арк.
2. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1813. – Рапарт ваеннага начальніка Мінскага павета аб часоваабавязаным селяніне Л. Янчэўскім, варожа настроеным супраць праваслаўнай веры і палітычна нядобранадзейным. 1866 г. – 12. арк.
3. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1915. – Рапарт рэчыцкага павятовага спраўніка У. Ульянава аб зняважэ ксяндзом Кунцэвічам абрадаў праваслаўнай царквы і нанясенні ім абраз станаваму прыставу Эйсманту. 1868 г. – 3 арк.
4. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1962. – Справа аб селяніне Якімовічы, які абвінавачваўся ў ганьбаванні праваслаўнай веры і пераходзе ў каталіцызм. 1868 г. – 4 арк.
5. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1964. – Справа аб забароне памешчыкам Рэчыцкага павета жонцы і дзецям выконваць абрады праваслаўнай веры. 17.12.1868–14.04.1869г. – 25 арк.
6. НГАБ. – Ф. 295.– Воп. 1. – Спр. 2007. – Аб прымушэнні да прыняцця праваслаўнага веравызнання мешчаніна м. Ракаў Л. Янчэўскага разам з сям'ёй.1869 г. – 3 арк.
7. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2009. – Справа аб абвінавачванні селяніна І. Рыхліцкага ў агітацыі супраць праваслаўнай веры. 24.10.1869–20.04.1870 г. – 7 арк.
8. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. – Спр. 2010. – Справа аб абвінавачванні селяніна Мінскага павета Н. Чашко ў агітацыі новадалучаных сялян в. Хатава супраць выканання абрадаў праваслаўнай веры. 10.01.1869–30.01.1869. – 8 арк.
9. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2015. – Справа аб невыкананні прыхаджанамі Валмянскай царквы абрадаў праваслаўнай царквы. 12.01.1869–05.01.1871. – 176 арк.
10. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2176. – Справа аб прыняцці мінскімі ксяндзамі на споведзь сялян Валмянскай воласці, якія былі далучаны да праваслаўя. 1870 г. – 5 арк.

11. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2184. – Ведамасці аб колькасці святароў і вернікаў у рымска-каталіцкіх парафіях па Мінскай і Ковенскай губернях. 18.06.1870–12.12.1872. – 158 арк.
12. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2795. – Справа аб супрацьзаконных дзеяннях ксяндза Ракаўскага касцёла Пласкавіцкага. 06.09.1875–10.09.1875. – 7 арк.
13. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2798. – Справа паводле прашэння сялян вёскі Лапаравічы Мінскага павета аб дазволе ім перайсці з праваслаўнай веры ў каталіцкую. 24.06.1874–06.01.1875. – 15 арк.
14. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2801. – Справа аб дазволе сялянам вёскі Хатава Мінскага павета вызнаваць каталіцкую веру. 17.10.1875–27.09.1876. –126 арк.
15. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 3063. – Справа аб усталяванні нагляду паліцыі за арганістамі К. Хвошчам і І. Адамовічам, якія праводзілі агітацыю сярод сялян за вяртанне да касцёла, перададзенага ў праваслаўнае ведамства. 21.06.1876–13.09.1876. – 7 арк.
16. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 3661. – Ведамасць аб асобах, якія знаходзіліся пад наглядам паліцыі за 1881 г. па паветах Мінскай губерні. 03.02.1881–09.01.1882. – 441 арк.
17. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 4540. – Справа аб абвінавачванні І. Віткоўскага ў ганьбаванні праваслаўнай веры. 11.04.1871–28.07.1871. – 7 арк.
18. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 6255. – Справа па прашэнні Вайцяхоўскага аб дазволе яму вызнаваць каталіцкую веру. 24.08.1896–26.04.1897. – 14 арк.
19. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2766. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Ракіцкіх. – 337 арк.
20. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31875. – Справа паводле распараджэння вышэйшага начальніка адносна зацвярджэння ў губерні праваслаўя і абмежаванні каталіцкай прапаганды. 04.07.1865–11.11.1865. – 28 арк.
21. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31876. – Справа аб святары Шымковічы, які адступіў ад абрадаў Праваслаўнай царквы пры хрышчэнні сваіх дзяцей і аб спакушэнні сялян Зуевых з праваслаўя ў раскол. 29.01.1865–09.03.1865. – 6 арк.
22. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31904. – Справа аб пераводзе ў праваслаўную веру 200 сялян у Полацкім павеце. 23.02.1865–31.05.1866.– 41 арк.
23. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31964. – Справа аб пераходзе з праваслаўя ў каталіцызм мяшчан Аляксандравай і Юзэфы Сцяпанавай. 28.04.1864–06.06.1864. – 9 арк.
24. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 33551. – Справа аб старшыні Каханавіцкай валасці Захары Гаўрылаве, які перайшоў з праваслаўя ў каталіцызм. 21.08.1867–19.09.1867. – 5 арк.
25. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 38. – Спр. 930. – Спавядальныя ведамасці Асвейскага прыхода Віцебскай губерні Дрысенскага павета. 1853 г. – 68 арк.

26. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. – Минск : БГУ, 2010 – 440 с.
27. Долбилов, М. Д. Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – Москва : Новое Литературное Обозрение, 2010. – 999 с.
28. Извеков, Н. Д. Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839 по 1889 г. / Н. Д. Извеков. – Масква : Печатня А. И. Снегиревой, 1899. – 522 с.
29. Матвейчык, Д. Ч. Удзельнікі паўстання 1863–1864 гадоў : біяграфічны слоўнік (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / Д. Ч. Матвейчык. – Мінск : Беларусь, 2016. – 735 с.
30. Staliunas, D. Making Russians. Meaning and Practice of Russification in Lithuania and Belarus after 1863 / D. Staliunas. – Amsterdam; New York : Rodopi B. V., 2007. – 465 p.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.09.2017

*Д. Ч. Матвейчык*

# Палітыкі супраць навукоўцаў: дыскусіі вакол зборніка дакументаў «1863 год на Меншчыне» (1928–1930 гг.)

Беларуская нацыянальная гістарыяграфія ў 1920–1930-я гг. праходзіла перыяд свайго станаўлення і бурнага развіцця. Айчынныя гісторыкі актыўна ўдзельнічалі ў нацыя- і дзяржаватворчых працэсах. У краіне былі адчынены Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) і іншыя новыя навучальныя і навуковыя ўстановы. Менавіта яны станавіліся цэнтрамі правядзення навуковых даследаванняў, тэматыка якіх з цягам часу ўсё больш пашыралася. У цэлым, гэта быў час фарміравання беларускай гістарычнай школы, асновай якой стаў «беларусацэнтрызм» – разгляд тых ці іншых працэсаў з пункту гледжання інтарэсаў беларускага народа.

Адной з праблем, за распрацоўку якой узяліся айчынныя гісторыкі, было паўстанне 1863–1864 гг. Свае працы на гэтую тэму выдалі Уладзімір Пічэта, Усевалад Ігнатоўскі, Міхась Мялешка, Ян Віткоўскі (іл. 1), Сяргей Цытовіч, Самуіл Агурскі, Даніла Васілеўскі, Аляксандр Шлюбскі, Іван Цьвікевіч і некаторыя іншыя. Розныя бакі развіцця беларускай міжваеннай гістарыяграфіі паўстання ўжо траплялі ў поле ўвагі такіх айчынных даследчыкаў як Уладзімір Міхнюк [10, с. 218–222], Вячаслаў Шалькевіч [18, с. 35], Васіль Мялешка і Уладзімір Палуян [5, с. 99–101,

пакаленне неслі непасрэдную ваенную («казацкую») службу і распараджаліся найбольшымі зямельнымі надзеламі. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі саслоўнае і тэрытарыяльнае адзінства жыхароў Вужы і Прарокаўшчыны было разбурана – пад пагрозай запрыгоньвання частка зямян выехала з маёнтка Грозава, а большасць з тых, хто застаўся, не здолела пацвердзіць дваранскі статус і была пераведзена ў аднадворцы.

**Доўнар Аляксандр Барысавіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

«Новыя матэрыялы па гісторыі Мінска XVI–XVIII стст. з фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва»

У артыкуле прыведзены рэестр справы 884 Г фонду 822 (вопіс 11) Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. Праводзіцца крыніцазнаўчая характарыстыка дакументаў дадзенай справы, падкрэсліваецца іх значнасць для даследавання гісторыі Мінска, вывучэння аб'ектаў нерухомасці горада ў XVI–XVIII стст. Складзены спіс гарадскіхураднікаў XVI–XVII стст., выяўленых у дакументах справы. Апублікаваны дакумент продажу крамы на мінскім рынку 1542 г.

**Еўстрацьеў Алег Ігаравіч,** магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (г. Мінск).

*«“Куроніка” ў Таемным дзяржаўным архіве прускай культурнай спадчыны ў Берліне (Германія)»*

Артыкул прысвечаны характарыстыцы дакументаў па гісторыі герцагства Курляндыя і Семігалія, якія захоўваюцца ў Таемным дзяржаўным архіве прускай культурнай спадчыны ў Берліне (Германія). Прыводзіцца апісанне зместу фондаў архіва, якія закранаюць розныя аспекты гісторыі Курляндскага герцагства. Артыкул утрымлівае сігнатуры спраў з фондаў архіва, якія адносяцца да гісторыі герцагства Курляндыя і Семігалія. У сувязі з гэтым ён можа служыць дапамогай у правядзенні даследаванняў, якія тычацца дадзенага рэгіёна Усходняй Прыбалтыцы ў перыяд ранняга Новага часу.

**Кароль Маргарыта Міхайлаўна,** магістр гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Супраціўленне пераводу ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гг.: дзейнасць «падбухторшчыкаў» і рэакцыя ўлад»*

Разглядаецца рэакцыя расійскіх улад на выпадкі супраціўлення прымусоваму пераводу ў праваслаўе пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Адзначаецца, што мясцовая адміністрацыя адмаўляла былым каталікам і ўніятам

(пераважна сялянам) у актыўнай ролі ў адстойванні ранейшага веравызнання і ўскладала адказнасць за непадпарадкаванне на разнастайныя групы «падбухторшчыкаў». Галоўнымі сярод іх лічыліся ксяндзы, шляхта і мясцовыя грамадскія актывісты, якія маглі не належаць да прывілеяваных саслоўяў. Аўтар прыходзіць да высновы, што часцей за ўсё галоўнымі арганізатарамі супраціўлення пераводу ў праваслаўе з'яўляліся не знешнія падбухторшчыкі, а самі сяляне, дакладней, найбольш паважаныя і аўтарытэтныя сярод іх.

**Лісейчыкаў Дзяніс Васільевіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Ад Невеля да Люцына: візіты ўніяцкіх цэркваў Полацкай пратапопіі 1684 г.»*

У артыкуле разглядаецца арганізацыя і правядзенне генеральных візітацый уніяцкіх цэркваў Полацкай епархіі ў XVII ст. У яе склад уваходзілі храмы на тэрыторыі Віцебскага, Інфлянцкага, Мсціслаўскага, Полацкага ваяводстваў, а таксама Браслаўскага павета Віленскага ваяводства Рэчы Паспалітай. Аналізуецца фармуляр запаўнення пратакола вынікаў праверкі, з'яўленне новых раздзелаў і рубрык. Акрэслена кола пытанняў, якія фіксуюцца ў візітах. У якасці прыклада публікуецца поўны тэкст захаванага фрагмента візітаў цэркваў Полацкага і Інфлянцкага ваяводстваў 1684 г. Сярод іншага, гэта самыя раннія падрабязныя дакументы аб дзейнасці ўніяцкіх парафій на тэрыторыі сённяшняй Латвіі. Сетка функцыянавання парафій «грэцкага абраду» адлюстроўвае межы рассялення «русінскай» этнаканфесійнай супольнасці ў рэгіёне і дае магчымасць акрэсліць мяжу ўстойлівых культурных уплываў Полацка.

**Матвейчык Дзмітрый Часлававіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Палітыкі супраць навукоўцаў: дыскусіі вакол зборніка дакументаў «1863 год на Меншчыне» (1928–1930 гг.)»*

Аналізуецца стаўленне некаторых дзеячаў навукі і палітыкі да зборніка дакументаў «1863 год на Меншчыне», выдадзенага супрацоўнікамі Інстытута беларускай культуры ў 1927 г., асвятляюцца асноўныя дыскусіі, якія вяліся на старонках савецкай прэсы, паказваюцца аргументы і контраргументы розных дыскутантаў. Выказваецца меркаванне, што гэтыя дыскусіі паўплывалі на палітызацыю ў цэлым тэматыкі паўстання 1863–1864 гг. у айчыннай гістарыяграфіі.

***Яго ж,** Рэцэнзія:* Polskie dziewiętnastowieczne pamiętniki i listy z Ziem Zabranych – rola i miejsce w badaniach historycznych / red. W. Caban i L. Michalska-Bracha. – Warszawa : DiG, 2017. – 535 s.

Аналізуецца зборнік артыкулаў міжнароднай групы даследчыкаў, прысвечаны падвядзенню вынікаў даследчага праекта «Успаміны і лісты польскіх

# Змест

## Архівазнаўства

*О. И. Евстратьев*

«Куроника» в Тайном государственном архиве прусского культурного наследия в Берлине (Германия). . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

## Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў

*А. Б. Доўнар*

Новыя матэрыялы па гісторыі Мінска XVI–XVIII стст. з фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва . . . . . . . . . . . 47

*А. А. Мяцельскі*

Інвентар Морацкага манастыра 1609 г.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

*Н. У. Сліж*

Тастамент гарадзенскага аптэкара Ганса Гансбаха 1673 г. . . . . . . . . . . 71

*Ю. Н. Снапковский*

«Великая европейская война» в жизни населения прифронтовых губерний в документах НИАБ. Часть IV (январь – июнь 1917 г.) . . . . . 77

## Крыніцазнаўства

*З. В. Антановіч*

Скасаванне шлюбу ў праваслаўнай царкве ў канцы XVIII – пачатку XX ст. (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) . . . . . . . . . . . . . . . 103

*Т. П. Варабей*

Касцёл Св. Яна Хрысціцеля ў Сталовічах – помнік «віленскага барока» (паводле інвентароў XVIII–XIX стст.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113

*М. А. Волкаў, С. Б. Ліневіч*

Гісторыя і ваенны патэнцыял Жаберскага замка паводле пісьмовых і археалагічных крыніц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126

*Д. В. Лісейчыкаў*

Ад Невеля да Люцына: візіты ўніяцкіх цэркваў Полацкай пратапопіі 1684 г. . . . . . . . . . . . 141

*Н. М. Палтаржыцкая*

Склад органаў гарадскога самакіравання Менска ў 1663–1680 гг. (паводле дакументаў актавых кніг) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

*П. Д. Скурко*

«Или в подарокъ кому отдасть – проклятъ будетъ»: практыкі і стратэгіі кнігакарыстання ў святле запісаў у кірылічных старадруках першай паловы XVII ст.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178

*К. В. Сыцько*

Парафіяльныя хронікі першай трэці XX ст. як крыніца па гісторыі Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі . . . . . . . . . . . 188

## Гісторыя

*Я. С. Глінскі*

Зямянская супольнасць вёсак Вужа і Пракокаўшчына Слуцкага княства ў другой палове XVII – першай трэці XIX ст.. . . . . 197

*М. М. Кароль*

Супраціўленне пераводу ў праваслаўе каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў пасля паўстання 1863–1864 гг.: дзейнасць «падбухторшчыкаў» і рэакцыя ўлад . . . . . . . . . . . . . 233

*Д. Ч. Матвейчык*

Палітыкі супраць навукоўцаў: дыскусіі вакол зборніка дакументаў «1863 год на Меншчыне» (1928–1930 гг.) . . . . . . . . . . . . . . . 247

*А. У. Мацук*

Выбары Сапегаў паслямі на сойм у панаванне Аўгуста III . . . . . . . . 257

*С. Н. Рындин*

Китайские подданные на территории белорусских губерний
в годы Первой мировой войны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 273

*В. В. Урублеўскі*

Парушэнне праваслаўнай царкоўнай практыкі пахавання
як адлюстраванне працэсу супрацьстаяння
ў Мінскай губерні каталікоў ліквідаваных парафій масаваму
пераводу ў праваслаўе
(другая палова XIX – пачатак XX ст.) . . . . . . . . . . . . . . . . 284

*Г. А. Флікоп-Світа*

Барацьба за выяву Бога:
лёс алтарных карцін царквы ў вёсцы Шчорсы
Навагрудскага павета пасля скасавання Уніі. . . . . . . . . . . . . . . . 294

## Генеалогія

*Ф. В. Чарняўскі*

Уступ да генеалогіі роду Вяжэвічаў: продкі і сваякі
Рыгора Шчасновіча Вяжэвіча, падсудка земскага
Менскага ваяводства ў 1579–1600 гг.. . . . . . . . . . . . . . . . . . 305

## Некралог

*М. А. Волкаў, Н. А. Скеп’ян*

Памяці Юрыя Мікалаевіча Бохана
(21.02.1966–13.04.2017) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 322

## Рэцэнзіі

Polskie dziewiętnastowieczne pamiętniki i listy
z Ziem Zabranych – rola i miejsce w badaniach historycznych /
red. W. Caban i L. Michalska-Bracha. –
Warszawa : DiG, 2017. – 535 s.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 326

Рэзюмэ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 331
Резюме . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 339
Summary . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 347

Правілы для аўтараў «Архіварыуса» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
Guidelines for authors of «Archivaryus» . . . . . . . . . . . . . . . . 357

A87 **Архіварыус:** зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 15 / рэдкал. : В. Ф. Голубеў [і інш.]. — Мінск : НГАБ, 2017. — 368 с., іл.

**ISSN 2225-4412.**

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі падрыхтаваны пятнаццаты выпуск штогодніка «Архіварыус». На яго старонках асвятляецца шырокае кола пытанняў гісторыі, архівазнаўства, археаграфіі, крыніцазнаўства і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплін. У навуковы ўжытак уводзіцца шэраг новых, раней невядомых дакументаў і фактаў.

Прызначаецца архівістам, гісторыкам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца старонкамі мінулага Беларусі.

**УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]**
**ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41**

**Навуковае выданне**

# Архіварыус

Зборнік навуковых
паведамленняў і артыкулаў

## Выпуск 15

Адказны за выпуск *Д. Ч. Матвейчык*
Рэдактар *В. В. Урублеўскі*
Карэктар *Т. В. Салавей*
Дызайнер вокладкі *Д. Ю. Бунеева*
Макет, камп'ютарная вёрстка *Я. А. Мальдзіса*
Малюнак эмблемы на авантытуле *А. У. Леўчыка*

Падпісана да друку 26.12.2017. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Гарнітура Times New Roman. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 21.39. Ул.-выд. арк. 21,3.
Тыраж 100 экз. Заказ ___.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў друкарні
вытворчае дачыннае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў № 2/18 ад 26.11.2013.
г. Мінск, пл. Свабоды, 23–90.